*4. Зеленин, Д. К.* Тотемы-деревья в сказаниях и обрядах европейских народов / Д. К. Зеленин. – М. ; Л. : Изд-во АН СССР, 1937. – 78 с. – (Тр. Ин-та антропологии, этнографии и археологии / АН СССР; т. 15, вып. 2).

*5. Крачковский, Ю. Ф.* Быт западнорусского селянина / Ю. Ф. Крачковский. – Изд. Имп. о-ва истории древностей рос. при Моск. ун-те. – М. : Унив. тип. (Катков и К$^{o}$), 1874. – 212 с.

*6. Никифоровский, Н. Я.* Простонародные приметы и поверья, северные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах / Н. Я. Никифоровский. – Витебск : Губерн. типолитогр., 1897. – 307 с.

*7. Нікольскі, Н. М.* Жывёлы ў звычаях, абрадах і вераваньнях беларускага сялянства / Н. М. Нікольскі ; адк. рэд. П. Ізох. – Менск [Мінск: б. в.], 1933. – 136 с.

*8. Рыбаков, Б. А.* Язычество древних славян / Б. А. Рыбаков ; Рос. акад. наук, Отд-ние истории, Ин-т археологии. – М. : Наука, 1981. – 607 с.

УДК 130.2(476)

**А. А. Падалінская,**

*кандыдат філасофскіх навук, старшы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут філасофii Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

## РОЛЯ ТРАДЫЦЫЙ І ТРАДЫЦЫЙНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ У НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНЫМ СВЕЦЕ БЕЛАРУСАЎ

**Анатацыя.** *Разглядаюцца роля і значэнне традыцый у сучасным беларускім грамадстве, сістэма традыцыйных каштоўнасцей беларусаў і яе ўздзеянне на маральна-этычную сферу грамадства, а таксама інавацыйная галіна гуманітарыстыкі – этнааксіялогія, якая займаецца вывучэннем светапоглядных, светаўяўленчых і аксіялагічных асноў традыцыйнага грамадства беларусаў, даследаваннем каштоўнасных установак і стэрэатыпаў грамадскай свядомасці, выяўленнем спецыфікі этычных канцэптаў.*

**Ключавыя словы:** *традыцыі, традыцыйныя каштоўнасці, нацыянальна-культурная ідэнтычнасць, універсаліі культуры, этнааксіялогія, маральна-этычныя канцэпты, парэміялогія.*

**A. Padalinskaya,**

*PhD in Philosophy, Senior Researcher of the State Scientific Institution "Institute of Philosophy of the National Academy of Sciences of Belarus", Minsk, Republic of Belarus*

# THE ROLE OF TRADITIONS AND TRADITIONAL VALUES IN THE NATIONAL AND CULTURAL WORLD OF THE BELARUSIANS

**Abstract.** *The article analyzes the role and importance of traditions in modern Belarusian society, the system of traditional values of Belarusian people and its influence on the moral and ethical sphere of the society. The author also examines the innovative direction of the humanities – ethnoaxiology. This direction studies the worldview and axiological foundations of the traditional society of the Belarusians, explores the values and stereotypes of social consciousness, and reveals the specifics of ethical ideas.*

**Key words:** *traditions, traditional values, national and cultural identity, cultural universals, ethnoaxiology, moral and ethical concepts, paremiology.*

Развіццё духоўнай культуры кожнага народа сацыяльна абумоўлена, дыктуецца патрэбамі часу, умовамі гістарычнага жыцця грамадства. Яно абапіраецца на духоўны вопыт папярэдніх пакаленняў, на лепшыя традыцыі мінулага, якія з'яўляюцца яго асновай і выступаюць неабходным сродкам сувязі, захавання пераемнасці. Дзякуючы пераемнасці забяспечваюцца непарыўнасць, цэласнасць гісторыка-культурнага працэсу ва ўмовах неаднастайнага сацыяльна-эканамічнага і палітычнага асяроддзя, узыходжанне на больш высокі ўзровень развіцця. Вось чаму праблемы пераемнасці і захавання традыцый такія актуальныя ў наш час.

Традыцыі з'яўляюцца неабходным атрыбутам сацыяльнай стабільнасці і ўстойлівасці грамадства, праз сістэму традыцыйных каштоўнасцей адбываецца ўзаемаразуменне людзей розных сацыяльнага становішча, культурнага і інтэлектуальнага развіцця і рэлігійных поглядаў. Дзякуючы традыцыям грамадства функцыянуе як цэласная і адзіная сістэма. Традыцыі адыгрываюць важную ролю ў забеспячэнні пераемнасці духоўных каштоўнасцей, ва ўзнаўленні культуры і трансляцыі калектыўнага вопыту, сацыяльных і сямейных адносін, стэрэатыпаў мыслення, спосабаў дзеяння, ведаў і дасягненняў. Засваенне традыцый садзейнічае фарміраванню і замацаванню ў грамадстве сацыяльных сувязей і каштоўнасных установак, звычаяў і норм паводзін, навыкаў грамадскай дзейнасці і светапогляду, спрыяе еднасці і далучанасці да культуры і жыцця продкаў.

У энцыклапедычным слоўніку можна знайсці наступнае вызначэнне: «Традыцыя – сукупнасць звычаяў, абрадаў, норм паводзін, поглядаў, правіл, якія складваюцца гістарычна, перадаюцца з пакалення ў пакаленне і адлюстроўваюцца ў элементах сацыяльна-культурнай спадчыны» [2, с. 320]. У працэсе гістарычнага развіцця традыцыі непазбежна трансфармуюцца ў сукупнасць узораў, норм, стэрэатыпаў, якіх неабход-

на прытрымліваецца і якія актуалізуюцца кожным наступным пакаленнем. Традыцыі служаць асновай нацыянальнай культуры і надаюць ёй унікальнасць, цэласнасць і самабытнасць. Без традыцый не толькі не існуе ніводнай культуры ў гісторыі чалавецтва, але без іх немагчыма ўявіць нават існаванне любога чалавечага грамадства. На аснове традыцый будуецца самаідэнтыфікацыя чалавека і супольнасцей, у іх акумулюецца культурная энергія соцыуму, якая садзейнічае далейшаму развіццю. Традыцыя – універсальная форма і механізм упарадкавання зместу культуры, што дазваляе «разглядаць тыя сэнсы культуры, якія ўтрымліваюцца ў вопыце, які прайшоў апрабацыю, але ўзнаўляюцца ў новых умовах не ў якасці анахранізму, але ў якасці элемента жывой сістэмы» [3, с. 39].

Дзякуючы традыцыі адбываецца трансляцыя культурных каштоўнасцей паміж пакаленнямі. Пад культурнымі каштоўнасцямі разумеюцца звычаі і абрады, маральна-этычныя і эстэтычныя нормы і прынцыпы, ацэнкі, ідэі, культурныя ўстаноўкі, стэрэатыпы паводзін і свядомасці, сапраўдная значнасць якіх здабываецца з дапамогай сацыяльнага вопыту. Успрыманне чалавека заўсёды дэтэрмінавана сістэмай культурных каштоўнасцей, якая вызначае напрамак індывідуальнага развіцця чалавека, яго дзейнасці, камунікацыі, працэсу набыцця ведаў. Дадзеная сістэма не толькі прадвызначае развіццё чалавека, але і накладае на яго пэўныя абмежаванні. Нормы і каштоўнасці дэтэрмінуюць паводзіны чалавека, яго светаўспрыманне і ўчынкі. Каштоўнасць з’яўляецца рухаючай сілай сацыяльных паводзін як аднаго суб’екта, так і ўсяго грамадства ў цэлым.

У аснове функцыянавання і развіцця любой культуры і любога грамадства ляжаць базавая сістэма каштоўнасцей, якая выступае ядром культуры, а таксама звязаныя з ёй традыцыі, нормы, правілы, стандарты паводзін, культурныя коды, сімвалы і ўзоры. Яны фарміруюць адзінае поле культуры, якое робіць усе ўзаемадзеянні зразумелымі, спарадкаванымі і прадказальнымі; праз устаноўленыя каштоўнасці вызначаюцца прыярытэты і вектары далейшага развіцця. Маральна-этычныя каштоўнасці – найважнейшыя кампаненты чалавечай культуры нароўні з нормамі і ідэаламі. Каштоўнасці, нормы і ідэалы дапамагаюць чалавеку правільна паступаць у той ці іншай сітуацыі, а таксама разумна і сумленна жыць і ўзаемадзейнічаць з іншымі членамі грамадскай супольнасці. У той час як традыцыі – гэта нешта пастаяннае, угрунтаванае на калектыўным вопыце, каштоўнасныя арыентацыі могуць змяняцца, уяўляючы сабой вынік вольнага выбару, гэты выбар не дэтэрмінаваны для чалавека генетычна. Каштоўнасці – прадукты сацыяльна-культурных працэсаў, па-за чалавечымі адносінамі яны не маюць сэнсу.

Ва ўмовах постіндустрыяльнага грамадства з яго перанасычанасцю рознымі культурнымі сэнсамі традыцыя ўяўляецца як сувязное звяно з гістарычнай памяццю і садзейнічае захаванню нацыянальна-культурнай

ідэнтычнасці і адраджэнню асобных культурных феноменаў. Традыцыя можа выконваць ролю культурнага кода гістарычнай памяці народа [4, с. 202–203]. З цягам часу сістэма культурных кодаў можа змяняцца. Тады элементы традыцыйнай каштоўнаснай сістэмы аказваюцца наноў запатрабаванымі дзякуючы іх захаванню ў культурнай памяці народа. Важнасць каштоўнасных арыентацый у жыцці таго ці іншага этнасу абумовіла іх «кадаванне» ў сістэме нацыянальнай культуры.

Сучасныя сацыяльныя працэсы сведчаць аб тым, што трансфармацыя каштоўнасных арыенціраў, якая адбываецца ў асобных нацыянальных супольнасцях у працэсе глабалізацыі, не азначае поўнага знішчэння замацаваных традыцый, назіраецца толькі частковае змяненне ў іерархіі каштоўнасных установак. Працэс звароту да традыцыйных каштоўнасцей не носіць характару пераносу статычнай і нязменнай традыцыі на новую глебу. У пошуках падстаў для культурнай ідэнтычнасці прыцягненне традыцыйных каштоўнасцей мае выбарчы характар, аксіялагічны шэраг падвяргаецца перапрацоўцы дзякуючы патрэбам новых выклікаў гістарычнага развіцця.

Праблеме вывучэння традыцыі і традыцыйнай культуры прысвечаны шматлікія даследаванні як у айчыннай, так і ў замежнай гістарыяграфіі. У межах традыцыязнаўства разглядаюцца праблемы сутыкнення «старых» і «новых» каштоўнасцей, пытанні цывілізацыйных і культурных адрозненняў, трансфармацыі і пераемнасці традыцыі, захавання традыцыйных каштоўнасцей і г. д. Праблема традыцыі шырока асветлена і распрацавана ў працах расійскіх даследчыкаў С. А. Аруцюнава, П. С. Гурэвіча, Б. С. Ерасава, В. У. Авер’янава, І. Т. Касавіна і г. д. Каштоўныя думкі пра культуру як аксіялагічную цэласнасць пакінулі М. А. Ліўшыц, Ю. М. Лотман, Д. С. Ліхачоў, С. Р. Варкачоў і інш. Даследаванню праблем крызісу традыцыйных форм культуры, разгляду традыцый як феномена культуры прысвечаны работы такіх заходніх мысліцеляў, як З. Бауман, Г. Маркузе, Ж.-Ф. Ліятар, К. Попер, А. Турэн, Б. Цёрнер, Ю. Хабермас.

Вялікая ўвага надаецца даследчыкамі праблемам суадносін традыцыі і навацыі, традыцыі і культуры, традыцыі і каштоўнасцей, а таксама ўплыву традыцыі на розныя аспекты жыцця чалавека, такія як: навука, рэлігія, маральна-этычная сфера, палітыка, сацыяльныя адносіны, паўсядзённае жыццё і інш.

У айчыннай гуманітарыстыцы пачынаючы з XIX ст. актыўна даследаваліся праблемы, прысвечаныя традыцыям, культуры і традыцыйным каштоўнасцям беларусаў. Прадстаўнікі розных навук – гісторыі, культуралогіі, антрапалогіі, этнаграфіі, этналогіі, мастацтвазнаўства, этналінгвістыкі, філалогіі, філасофіі, фалькларыстыкі і інш. вывучалі і апісвалі народныя традыцыі і абрады, светапогляд і культурныя каштоўнасці традыцыйнай беларускай супольнасці.

Пяршынства сярод сучасных даследаванняў належыць у першую чаргу Цэнтру даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры

НАН Беларусі, а таксама Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту культуры і мастацтваў. Вынікі працы навукоўцаў і выкладчыкаў вышэйзгаданых устаноў, а таксама шэрагу іншых навуковых і ўстаноў вышэйшай адукацыі Беларусі з'яўляюцца вельмі актуальнымі для вырашэння сучасных праблем захавання і развіцця нацыянальнай культуры і нацыянальных традыцый. Адным з прыкладаў рэканструкцыі народнай светапогляднай традыцыі стала калектыўная манаграфія супрацоўнікаў Інстытута філасофіі НАН Беларусі «Трошкі бліжэй да Сонца, трошкі далей ад Месяца: беларуская народная філасофія» [5]. На базе этнаграфічнага матэрыялу аўтары манаграфіі паспрабавалі выявіць і рэканструяваць усё багацце інтэлектуальна-маральнага свету і каштоўнасцей беларусаў. Значная ўвага нададзена каштоўнаснаму складніку беларускай традыцыйнай карціны свету – прыродзе, характарыстыкам і мадальнасці каштоўнасцей, іх іерархіі і ўзаемаадносінам.

Даследаванне каштоўнасцей – фундаментальнае для разумення індывідуальных і калектыўных матывацый, выбараў, прыярытэтаў. Разуменне таго, што ёсць дабро, а што зло, што з'яўляецца правільным, справядлівым, пажаданым ва ўчынках чалавека яднае супольнасць і, пасутнасці, вызначае прыналежнасць да яе. Даследаванне каштоўнасна маркіраваных выказванняў, у першую чаргу прыказак, прымавак і фразеалагізмаў, дазваляе выяўляць культурныя каштоўнасці і сэнсы, а таксама ступень інтэграванасці сістэмы каштоўнасцей у нацыянальную культуру.

Паскораныя тэмпы прагрэсу паставілі перад сучасным чалавецтвам невядомыя раней праблемы. Нявызначанасць і альтэрнатыўнасць гістарычнага развіцця прыводзяць нашае пакаленне да разгубленасці. У дадзеных умовах набывае актуальнасць зварот да традыцыйнай сістэмы каштоўнасцей, да этычных канцэптаў народнай філасофіі, якія выступаюць падмуркам цэласнасці і ўстойлівасці грамадства. Уся сукупнасць традыцыйных маральна-этычных каштоўнасцей, іх узаемасувязь і іерархія, увасабленне ў грамадскім і культурным жыцці адлюстраваны ў этнааксіялогіі – інавацыйнай галіне гуманітарыстыкі, якая ўваходзіць у склад этнафіласофіі. Асноўнымі задачамі этнааксіялогіі з'яўляюцца вывучэнне светапоглядных, светаўяўленчых і аксіялагічных асноў традыцыйнага грамадства беларусаў, даследаванне каштоўнасных установак і стэрэатыпаў грамадскай свядомасці, выяўленне спецыфікі этычных канцэптаў. Этнааксіялогія выступае як частка этнафіласофіі, імплікаваная ў катэгорыях народнай фразеалогіі і парэміялогіі, народна-паэтычнай творчасці і фальклоры. Аксіялагічны падыход у межах этнафіласофіі дазваляе звярнуць увагу на асобасныя, агульначалавечыя і этнакультурныя каштоўнасці традыцыйнага грамадства, маральныя рэгулятывы і нормы паводзін, формы каштоўнаснай рэтрансляцыі. Будучы іманентна ўключанай у сістэму грамадскіх адносін, этнааксіялогія з'яўляецца інструментам уплыву на развіццё грамадскай свядомасці, цэласнай сістэмы каштоўнасцей і маральна-этычных арыентацый грамадства.

У традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў парэміі (прыказкі і прымаўкі) займаюць важнае месца дзякуючы сваёй філасафічнасці, вобразнасці і змястоўнасці, а таксама сканцэнтраваным у іх змесце маральна-этычным каштоўнасцям. У іх утрымліваецца каштоўнасна-нарматыўная сістэма этнасу, этнічна маркіраваны светапогляд і каштоўнасныя адносіны да існага з пазіцый штодзённай свядомасці. З аксіялагічнага пункту гледжання парэміі заключаюць у сабе вялікі маральна-этычны патэнцыял і адлюстроўваюць імкненне беларускага народа да самаўдасканалення і маральнага ідэала. Згодна з прызначэннем выразы-рэфлексіі валодаюць накіроўваючай, матывацыйнай і рэгулятыўнай функцыямі. Яны змяшчаюць пэўныя стандарты і мадэлі паводзін і рэагавання на ўзгодненасць ці разузгадненне каштоўнасных пазіцый прадстаўнікоў соцыуму, выступаюць сродкам карэкцыі «скажэнняў» у прыродзе чалавека, што з’яўляецца ўмовай захавання культурнага адзінства грамадства.

Прыказкі і прымаўкі з’яўляюцца своеасаблівай энцыклапедыяй народнай мудрасці, змяшчаюць не толькі багаты працоўны і жыццёвы вопыт народа, але і адлюстроўваюць псіхалагічныя адзнакі і маральна-духоўныя адметнасці і светапогляд нашых продкаў. Прыказкі і прымаўкі з’яўляюцца ўнікальнай скарбніцай пэўнай этнакультурнай і гістарычнай інфармацыі пра беларусаў, рэпрэзентуюць асаблівасці іх менталітэту, этнапсіхічнага складу і нацыянальнага характару, спосабу мыслення і маральна-этычных норм паводзін. Праз вусную перадачу яны замацоўваюцца ў падсвядомасці і транслююцца з пакалення ў пакаленне. З дапамогай іх можна рэгуляваць, карэкціраваць і стымуляваць паводзіны людзей, фарміраваць нацыянальна-культурную свядомасць, набываць веды пра спецыфіку менталітэту і этнапсіхічных адметнасцей беларусаў як нацыі, пра іх звычаі і традыцыі, асаблівасці духоўнага свету і адметныя рысы народнай маралі [1, с. 6].

Прыказкі і прымаўкі – гэта не толькі скарбніца народнай мудрасці беларусаў, але і дастаткова паказальны і ўдзячны моўны матэрыял для выхавання ў дзяцей такіх маральных якасцей, як справядлівасць, праўдзівасць, дабрыня, таварыскасць, гасціннасць і інш. Фарміраванне ўяўленняў пра дабро і зло адбывалася ў кожнай канкрэтнай сям’і і працягвалася ў грамадзе, грамадстве. Рэгуляванне грамадскіх адносін у грамадзе адбывалася згодна з «залатым правілам маралі» – «Не чыні другому таго, што табе не міла» [6, s. 70].

Канцэптасферу нацыянальна-культурнага свету беларусаў складае шырокі набор канцэптаў, якія адпавядаюць універсаліям культуры і раскрываюць сутнасныя аспекты і глыбінныя ўзроўні экзістэнцыяльнага складніка ментальнасці, вызначаюць іерархію каштоўнасцей і формулы сэнсу жыцця. Універсаліі культуры – гэта аснова разумення свету і месца чалавека ў ім, своеасаблівая сістэма каардынат, згодна з якой кожны чалавек арыентуецца ў прасторы. Ва ўніверсаліях культуры

канстытуіруецца светаўяўленне, спецыфічнае для пэўнай супольнасці на тым ці іншым этапе гісторыі. Універсаліі культуры ствараюцца з архетыпічных прынцыпаў, канстант свядомасці, культурных кодаў, інварыянтаў, ідэй, што праходзяць праз стагоддзі. Яны выступаюць базіснай структурай чалавечай свядомасці і з'яўляюцца катэгарыяльнай асновай для кожнай гістарычнай эпохі.

У ментальна-культурнай прасторы аксіялагічныя канцэпты ўзаемадзейнічаюць паміж сабой і служаць ключом да разумення светапогляду беларускага народа: дабро і зло спалучаецца са справядлівасцю/несправядлівасцю, лёс з доляй, справядлівасць з праўдай, лёс і доля са шчасцем/няшчасцем, верай і надзеяй і г. д. Такія маральна-этычныя канцэптуальныя апазіцыі, як дабро/зло, справядлівасць/несправядлівасць, праўда/крыўда, шчасце/няшчасце, доля/нядоля, цесна звязаныя з паўсядзённым жыццём беларусаў, іх пазнаннем і разуменнем навакольнага свету і адлюстроўваюць духоўны вопыт нацыянальна-культурнай грамады. Гэта базісныя канцэпты этнааксіялогіі, праз прызму якіх ацэньваліся ўчынкі чалавека, яго адносіны да іншых людзей, да жыццёвых і грамадскіх праблем, да свету прыроды і рэчаў. Універсальнасць дадзеных апазіцый заключаецца ў тым, што яны закладзены ў падмурак усялякай чалавечай дзейнасці і адносін.

Прадстаўленыя аксіялагічныя канцэпты прэзентуюць у моўнай карціне свету беларусаў іх духоўныя каштоўнасці і арыенціры, адлюстроўваюць традыцыйнае мысленне народа, абумоўленае нацыянальна-культурным светапоглядам і ментальнымі асаблівасцямі. Парэміялагічны фонд беларусаў з'яўляецца акумулятарам і транслятарам традыцыйнай культурнай інфармацыі, народнай светапогляднай сістэмы, засяроджаннем этнакультурных каштоўнасцей, калектыўнага жыццёвага вопыту і народнай мудрасці, якія набываліся на працягу шматлікіх стагоддзяў і працягваюць жыць зараз у традыцыйнай свядомасці і народнай філасофіі.

Ролю традыцый і традыцыйных каштоўнасцей у сучасным грамадстве немагчыма пераацаніць. Традыцыі ўвабралі народную філасофію, маральныя нормы і ідэалы, гістарычную памяць. Маральна-этычныя каштоўнасці, увасобленыя ў традыцыйнай культуры беларусаў, адыгрываюць асаблівую ролю ў фарміраванні сацыяльна-гістарычных якасцей і нацыянальных характарыстык яе носьбітаў, садзейнічаюць захаванню ідэнтычнасці і гістарычнай памяці. Дзякуючы трансляцыі культурных каштоўнасцей з пакалення ў пакаленне адбываецца рэтрансляцыя сацыякультурнага кода нацыі. Адлюстраваная ў парэміялогіі нацыянальная карціна свету беларусаў з'яўляецца феноменам нацыянальна-культурнай спадчыны нашага народа. Гэтыя культурныя скарбы, закладзеныя ў прыказках і прымаўках, раскрываюць нашу гісторыю, далучаюць да народнай мудрасці, маральных і эстэтычных каштоўнасцей, створаных беларусамі за стагоддзі, дапамагаюць зразумець іх

філасофію, асаблівасці менталітэту і каштоўнасныя арыенціры. Бо толькі тады, калі мы ўсвядомім усю значнасць і неабходнасць той багатай культурнай традыцыі, якую нам падаравалі нашыя продкі, мы здолеем аб'яднаць грамадства на прынцыпах дабра, справядлівасці, чалавекалюбства і забяспечыць далейшы культурны прагрэс.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. *Дзядова, А. С.* Чалавек у люстэрку беларускай фразеалогіі і парэміялогіі : манаграфія / А. С. Дзядова ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Віцеб. дзярж. ун-т імя П. М. Машэрава, каф. беларус. мовазнаўства. – Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2013. – 161 с.

2. *Дубянецкі, Э. С.* Культуралогія : энцыкл. давед. / Э. С. Дубянецкі ; маст. А. А. Глекаў. – Мінск : БелЭн, 2003. – 384 с.

3. *Костина, А. В.* Национальная культура. Этническая культура. Массовая культура. «Баланс интересов» в современном обществе / А. В. Костина. – М. : ЛИБРОКОМ, 2009. – 214 с.

4. *Николаев, Р. М.* Роль традиционных ценностей в процессе становления новой культурной идентичности советского народа в довоенный и военный период / Р. М. Николаев // Искусствоведение и культурология. – 2011. – С. 196–208.

5. Трошкі бліжэй да Сонца, трошкі далей ад Месяца: беларуская народная філасофія / Т. В. Валодзіна [і інш.] ; уклад. і агул. рэд.: І. М. Дубянецкая, С. І. Санько ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск : Беларус. навука, 2021. – 481 с.

6. *Federowski, M.* Lud Białoruski na Rusi Litewskiej: materjały do etnografji słowiańskiej zgromadzone w latach 1877–1905 / M. Federowski. – Warszawa : T-wo naukowe Warszawskie, 1935. – 490 s.


УДК 008(476):161.201.6


**А. І. Смолік,**

*доктар культуралогіі, прафесар, загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*


# АТРЫБУЦЫЯ І СІСТЭМНАЕ ДАСЛЕДАВАННЕ АРТЭФАКТАЎ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ Ў БЕЛАРУСІ


**Анатацыя.** *У артыкуле аналізуецца вопыт сацыяльных інстытутаў па атрыбуцыі і сістэмным даследаванні аб'ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны беларускага народа. Адзначаецца актуальнасць іх дзейнасці, якая дэтэрмінавана крызісам культурнай ідэнтычнасці,*